# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:908]:168.1

*І. І. Бамбешка*

## Краязнаўчы музей: трансфармацыя дэфініцыі і зместу дзейнасці

*На аснове гісторыка-генетычнага метаду аўтар аналізуе фарміраванне дэфініцыі «краязнаўчы музей» і эвалюцыю зместу яго дзейнасці, што адбывалася пад уплывам трансфармацыі сацыякультурнага кантэксту.*

Сучасная сацыякультурная сітуацыя, якая фарміруецца пад уплывам глабалізацыйных працэсаў, аказвае ўздзеянне на светапогляд і светаўспрыманне чалавека, пошук ім новых каштоўнасцей і жыццёвых арыенціраў. Распаўсюджанне масавай культуры паставіла пад пагрозу захаванне індывідуальнасці і прывяло да так званага крызісу ідэнтычнасці.

Паколькі пачуццё ідэнтычнасці грунтуецца на засваенні нацыянальнай культуры, то пераадоленне крызіснай сітуацыі магчыма з яе дапамогай. Не апошняя роля ў захаванні і трансляцыі нацыянальнай культурнай спадчыны належыць музеям, і ў прыватнасці краязнаўчым. Менавіта краязнаўчы музей можа рэалізаваць місію культурнага, духоўнага, навуковага і прадстаўнічага цэнтра рэгіёна ці пэўнай мясціны. Яго дзейнасць па вывучэнні, захаванні і актуалізацыі карэннай самабытнай культуры, з аднаго боку, дапамагае мясцоваму насельніцтву захоўваць этнакультурную ідэнтычнасць, а з другога, прэзентуючы культуры іншых этнасаў, фарміруе міжкультурны дыялог.

Пытанне аб місіі краязнаўчага музея стала прадметам даследу сучасных музеёлагаў: Т. А. Булыгінай [3], Т. А. Размуставай [13], І. І. Крота [8] і інш. Перш чым рабіць агляд яго вынікаў, звернемся да аналізу таго, як развівалася дэфініцыя «краязнаўчы музей».

Тэрмін «краязнаўчы музей» з'явіўся пазней, чым установы, якія ім абазначаюцца.

Папярэднікамі краязнаўчых музеяў былі правінцыяльныя, мясцовыя музеі ці музеі мясцовага краю, якія пачалі з'яўляцца ў асобных краінах Еўропы ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Так, менавіта ў азначаны перыяд у Францыі правінцыяльныя музеі, у якіх часцей за ўсё былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлены творы мастакоў і скульптараў мясцовых школ, былі створаны ў гарадах: Бардо, Марсель, Ліён, Руан, Кан, Нант, Дыжон, Страсбург, Тулуза, Нансі і інш. У Вялікабрытаніі сярод калекцыянераў, якія не мелі магчымасці па фінансавых прычынах наведваць краіны Міжземнамор'я і пазнаёміцца з антычнымі каштоўнасцямі, вельмі папулярнай стала мясцовая гісторыка-культурная спадчына. З-за адсутнасці нацыянальнага музея старажытнасцей мясцовыя помнікі станавіліся асновай для стварэння правінцыяльных музеяў. Падобныя музеі атрымалі далейшае развіццё ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ужо не толькі ў Вялікабрытаніі і Францыі, але і Германіі, і Аўстрыі. Правінцыяльныя музеі дакументавалі і папулярызавалі культуру і гісторыю асобных тэрытарыяльных адзінак, вывучалі мясцовыя старажытнасці. У Германіі дзейнічалі дзясяткі падобных музеяў, якія атрымалі нават спецыфічную назву «die Heimatsmuseen» (літаральна – «музеі роднага краю»).

Аналагічныя працэсы адбываліся і ў Расійскай імперыі. Цікавасць да мясцовай гісторыі, мясцовай культуры, да мясцовага мастацтва стала матывам і імпульсам да стварэння на месцах музеяў, якія атрымалі назву «мясцовыя музеі». Яны складаліся з прыродазнаўчых, гістарычных, мастацкіх аддзелаў і задумваліся як комплесныя цэнтры захавання матэрыялаў і інфармацыі мясцовага краязнаўчага значэння [13, с. 142]. Іх развіццё ў наступныя дзесяцігоддзі адбывалася ў рэчышчы буйных сацыяльных рэформ 1860–1870-х гг., якія стварылі ўмовы для адкрыцця музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах, навуковых таварыствах і камісіях (царкоўна-археалагічных, архіўных і г. д.), навучальных установах.

Даследчыкі савецкага перыяду звязвалі станаўленне мясцовых (краязнаўчых) музеяў у Расіі з рэалізацыяй адмысловага сацыяльнага праекта, ініцыятарам якога выступіла дэмакратычна настроеная інтэлігенцыя [6; 11]. Яго надзвычай шырокія задачы – выяўленне ў вясковых традыцыях рэальных «парасткаў некапіталістычных адносін», «абуджэнне ў народзе творчых сіл», пераадоленне рознага роду недахопаў народнага жыцця, фарміраванне палітычнай самасвядомасці народных мас, далучэнне іх да неабходных у гаспадарцы і побыце практычных ведаў. На мясцовыя (краязнаўчыя) музеі ўскладаліся вялікія надзеі: яны павінны былі акумуляваць веды, якія не адасоблены ад практыкі і ад патрэб працоўных. Такія адносіны да краязнаўчых музеяў захоўваліся і ў савецкі час, напрыклад, у тых патрабаваннях, якія прад'яўлялі да краязнаўчых музеяў і грамадскасць, і партыйнае кіраўніцтва, і навукоўцы [5, с. 245–246].

Акрамя таго, масавае стварэнне музеяў, у тым ліку і музеяў мясцовага краю, было абумоўлена агульным адукацыйным уздымам той эпохі, асветніцкай дзейнасцю інтэлігенцыі і выключным ростам адукацыйнай актыўнасці саміх народных мас [1, с. 30].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музеі на месцах павінны былі задавальняць культурныя духоўныя патрэбы, прадставіць у шырокім доступе вынікі навуковых пошукаў, творчай працы папярэднікаў, прылады і вырабы іх працы, іх сувязь з дадзенай мясцовасцю, тое, што аб'ядноўвае чалавека з бацькаўшчынай, родным кутом, яго краявідамі, з продкамі, якія шмат зрабілі для дабрабыту гэтай зямлі. Такім чынам, мясцовыя музеі з'яўляліся свайго роду энцыклапедыямі звестак, непасрэдна датычных пэўнага рэгіёна.

У савецкі перыяд адбыліся маштабныя перамены ва ўсіх сферах жыцця, якія былі абумоўлены станаўленнем новай ідэалогіі і новай культурнай палітыкі і якія не маглі не адбіцца на развіцці музейнай справы. III Усерасійскі з'езд Саветаў у студзені 1918 г. абвясціў, што прыярытэтная задача музейнай справы «не толькі захаваць каласальныя музейныя каштоўнасці, якія засталіся ў спадчыну ад мінулага, але і пераўтварыць сховішча ў агульнадаступныя музеі і зрабіць іх крыніцай выхавання» [14, с. 6]. З гэтага моманту музеі станавіліся прапагандысцкімі ўстановамі, цэнтрамі асветніцкай работы ў строга акрэсленых уладамі ідэалагічных межах.

Паралельна з развіццём музейнай справы ў міжваенныя дзесяцігоддзі стаў шырока распаўсюджвацца краязнаўчы рух, які быў накіраваны на вывучэнне роднага краю (пэўнай мясцовасці) і адпавядаў агульнаеўрапейскаму інтэлектуальнаму руху, вядомаму пад назвай «рэгіяналізм».

Канцэпцыя рэгіяналізму была сфармулявана ў другой палове XIX ст. у Францыі правансальскім паэтам Фрэдэрыкам Містралем (1830–1914). Росквіт рэгіяналізму ў Еўропе прыпадае на 1920-я гг. Яго сутнасць была ў папулярызацыі навуковых ведаў, стварэнні ўмоў для навуковай працы ў правінцыі, абуджэнні ў мясцовых жыхароў ініцыятывы. У той час у розных краінах адначасова было распрацавана шмат розных праграм, скіраваных на перамены ў правінцыяльным жыцці – адміністрацыйным, гаспадарчым і культурным [4, с. 129]. Што датычыцца адміністрацыйнай сферы, то рэгіяналізм прадугледжваў пераразмеркаванне дзяржаўнай улады з цэнтра ў рэгіёны, павышэнне ролі мясцовага самакіравання. Цесна з гэтым было звязана развіццё мясцовай прамысловасці і эканомікі ў цэлым, а таксама мясцовай народнай культуры.

Рэалізацыя ідэй рэгіяналізму ў сферы беларускай культуры пачыналася ў міжваенны перыяд і здзяйснялася рознымі шляхамі.

Рэгіяналізм у Заходняй Беларусі развіваўся ў агульнаеўрапейскай, а дакладней, французскай традыцыі. Тэорыя рэгіяналізму знайшла ў Польшчы шматлікіх прыхільнікаў сярод грамадскіх, палітычных дзеячаў, навукоўцаў і ўвасобілася ў самастойны культурна-грамадскі рух. Заўважым, што тэорыя рэгіяналізму набыла распаўсюджанасць і папулярнасць у Польшчы і з той нагоды, што яна ўскосна абгрунтоўвала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалагічныя падставы для суіснавання іншаэтнічных земляў, з улікам іх этнічных і гістарычных традыцый, у межах адзінай Польскай дзяржавы [9, с. 185].

У БССР, як і ў цэлым у СССР, рэгіяналізм прыняў некалькі іншыя формы. Зарадзіўся ў рэчышчы педагагічнай навукі ў кірунку патрыятычнага выхавання. Адным з першых, хто распрацаваў у 40-х гг. XIX ст. псіхолага-педагагічнае абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання «навакольнага матэрыялу» ў навучанні, быў вядомы расійскі педагог К. Д. Ушынскі. Менавіта ён увёў у педагогіку блізкі па значэнні да «краязнаўства» тэрмін «родиноведение» («радзімазнаўства») як пазнанне мясцовага краю.

Тэрмін «краязнаўства» першапачаткова з'явіўся таксама ў педагагічнай навуцы, і першым яго выкарыстаў рускі педагог У. Я. Уланаў у значэнні «гісторыя краю», ці «мясцовая гісторыя» [16]. Можна меркаваць, што прыкладна ў той жа час ён стаў распаўсюджвацца і ў беларускай педагагічнай практыцы, якая адчувала значны расійскі ўплыў. У акадэмічным слоўніку рускай мовы (1916) давалася яго кароткае азначэнне: «вывучэнне дадзенага краю, краіны» [7]. Аднак першапачаткова тэрмін «радзімазнаўства» быў больш пашыраны. У Беларусі існаваў яго адпаведнік – «беларусазнаўства». Пэўны час згаданыя тэрміны суіснавалі, аб чым сведчаць і беларуска-рускія перакладныя слоўнікі, якія ў значнай колькасці з'явіліся ў пачатку 1920-х гг.

З сярэдзіны 1920-х гг. тэрмін «краязнаўства» замацаваўся канчаткова, увабраўшы ў сябе тэрміны-сінонімы. Падобныя трансфармацыі адбываліся і з паняццем «краязнаўчы музей», паралельна з якім у першыя паслярэвалюцыйныя гады суіснавалі тэрміны «мясцовы музей», «губернскі музей», «правінцыяльны музей», «радзімазнаўчы музей». Распаўсюджанне тэрміна «краязнаўчы музей» у паслярэвалюцыйны перыяд было, акрамя ўсяго іншага, абумоўлена і ўвядзеннем у Расіі новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі «край», што выклікала змены ў назве мясцовых устаноў. Аднак больш важным, на наш погляд, было тое, што працэс рэарганізацыі ў сярэдзіне 1920-х гг. мясцовых музеяў у краязнаўчыя быў накіраваны на замену музейнай варыятыўнасці ў рэгіёнах нарматыўнай аднастайнасцю – з тыповай структурай і зместам дзейнасці.

Першыя спробы падвесці ўсе музеі пад адзіны стандарт былі зроблены ў распрацаваным у 1925 г. аддзелам музеяў Галоўнавукі Народнага камісарыята асветы РСФСР Палажэнні аб губернскіх музеях. Незалежна ад складу збораў музея Палажэнне ўводзіла аднолькавую назву, якая ўключала найменне месцазнаходжання і абавязковае слова «краязнаўчы». Такім чынам, адбывалася замена тэрміна «мясцовы музей» на «краязнаўчы музей». Згаданы дакумент устанаўліваў і структуру музея ў складзе прыродазнаўчага, культурна-гістарычнага і сацыяльна-эканамічнага аддзелаў [10].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэарэтыкі і практыкі музейнай працы чакалі ад краязнаўчых музеяў, што яны як «самая аптымальная і даступная форма, прызначаная адлюстраваць у сабе прыроду і жыццё і захоўваць у сабе іх дакументы», стануць візітнай карткай краю, якая змяшчала вельмі шырокі дыяпазон інфармацыі: ад прыродных асаблівасцей і жыццядзейнасці першых пасяленцаў да сучаснага стану [2, с. 13]. Аднак на практыцы ўніфікацыя структуры краязнаўчых музеяў, якая суправаджалася шматлікімі тыпавымі палажэннямі, інструкцыямі і метадычнымі рэкамендацыямі, пераўтварыла некалі жывыя мясцовыя музеі ў «безаблічныя інструменты ідэалагічнай прапаганды» [13, с. 144].

Савецкая ўлада разглядала краязнаўчыя музеі як важныя рэгіянальныя цэнтры адукацыі і выхавання ў пэўным патрыятычна-ідэалагічным кірунку. Менавіта па гэтай прычыне краязнаўчыя музеі ў канцы 1930-х гг. аднымі з першых адчулі ідэалагічны ўціск з боку дзяржавы, што прывяло да катастрафічных вынікаў: шмат краязнаўчых установаў разам з іх музеямі перастала існаваць. І большасць іх каштоўных збораў таксама была незваротна страчана. У наступныя гады скарачэнне краязнаўчых музеяў працягвалася, паколькі падчас Вялікай Айчыннай вайны значная колькасць музеяў на акупіраванай тэрыторыі была знішчана і разрабавана. У пасляваенны час улады вярнуліся да краязнаўчых музеяў, дзейнасць якіх у чарговы раз была падагнана пад ідэалагічныя стандарты: у музеях былі створаны ўніфікаваныя, падобныя экспазіцыі, якія будаваліся па агульнай схеме. У нарматыўных дакументах, якімі неабходна было кіравацца краязнаўчым музеям, адзначалася, што яны павінны стаць навуковымі цэнтрамі краязнаўства, месцам канцэнтрацыі асноўнай інфармацыі аб прыродзе, гістарычным мінулым і сацыялістычнай перабудове краю [5, с. 247]. Такі падыход адлюстраваўся ў вызначэнні краязнаўчых музеяў як музеяў комлекснага профілю, зборы якіх дакументуюць гісторыю і прыроду канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна [15, с. 70]. Аднак у рэальнасці ставілася мэта паказаць асаблівасці краю ў рэчышчы марксісцка-ленінскай канцэпцыі паслядоўнага праходжання адпаведных грамадска-эканамічных фармацый і згодна з імі фарміраваць раздзелы экспазіцыі. Краязнаўчы музей у падобнай сітуацыі выступаў не столькі захавальнікам рэгіянальнай самабытнасці, колькі сродкам насаджэння адзінага стандарту мыслення. Нацыянальная і рэгіянальная складовыя часткі гісторыі і культуры краю ў такім выпадку прадстаўляліся выключна этнаграфічнымі рысамі.

У 1990-х гг. разам з сацыяльна-палітычнымі зменамі, распадам СССР актуалізаваліся праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці, дэмакратызацыі грамадства, што паўплывала і на змяненне погляду на музейную дзейнасць, музейную ўстанову. Расійская музейная энцыклапедыя (2001) прапанавала наступнае азначэнне краязнаўчых музеяў: гэта музеі, зборы якіх дакументуюць розныя бакі жыцця (прыродныя ўмовы, гістарычнае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

развіццё, эканоміку, побыт, культуру) канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна ці населенага пункта (рэспублікі, края, акругі, вобласці, горада, раёна, вёскі), складаюць частку яго прыроднай і культурнай спадчыны [12, с. 298].

У сённяшняй Беларусі ва ўмовах крызісу ідэнтычнасці, узмацнення працэсу глабалізацыі і процілеглага – лакалізацыі краязнаўчыя музеі, якія генерыруюць мясцовую культуру на аснове захавання і рэвіталізацыі найбольш каштоўнай яе часткі, становяцца вельмі запатрабаванымі. Менавіта краязнаўчыя музеі цераз памяць родавую, мясцовую, а значыць, блізкую кожнаму чалавеку, вырашаюць важнейшую задачу: ладзяць міжпакаленную гістарычную памяць чалавецтва.


1. *Балакирев, А. С.* Духовно-идеологические факторы развития отечественного музееведения (к постановке проблемы) / А. С. Балакирев // Проблемы теории, истории и методики музейной работы : сб. науч. тр. / М-во культуры РФ ; ГЦМСИ России. – М., 2000. – Вып. 25. – С. 5–70.

2. *Богданов, В. В.* Значение областных музеев для задач краеведения / В. В. Богданов // Краеведение. – 1923. – №1. – С. 11–14.

3. *Булыгина, Т. А.* Краеведческий музей и источники местной истории [Электронны рэсурс] / Т. А. Булыгина // Новые исследовательские практики изучения местной истории : интернет-конференция 2005. – Рэжым доступу : http://www.newlocalhistory.com/node/870. – Дата доступу : 20.08.2016.

4. *Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.

5. *Златоустова, В. И.* Государственная политика в области музейного дела (1945–1985) / В. И. Златоустова // Музей и власть : сб. науч. тр. : в 2 ч. / НИИ культуры ; отв. ред. С. А. Каспаринская. – М., 1991. – Ч. 1. – С. 226–298.

6. *Ионова, О. В.* Создание сети краеведческих музеев РСФСР в первые 10 лет Советской власти / О. В. Ионова // Труды Научно-исследовательского института музееведения. – М., 1957. – Вып. 1. – С. 37–57.

7. Краеведение // Словарь русского языка : в 9 т. – СПб., 1916. – Т. 4, вып. 9. – Ст. 2581.

8. *Кротт, И. И.* Музей и новая локальная история: возможность взаимодействия в проблемном поле современного исторического знания / И. И. Кротт // Музейные ценности в современном обществе : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 130-летию Омского гос. ист.-краевед. музея, Омск, 14–17 мая 2008 г. – Омск, 2008. – С. 206–208.

9. *Лабачэўская, В. А.* Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 375 с.

10. Положение о губернских музеях // Бюллетень Наркомпроса. – 1925. – № 4.

11. *Равикович, Д. А.* Музеи местного края во второй половине XIX – начале XX в. / Д. А. Равикович // Очерки истории музейного дела в России. – М., 1960. – Вып. 2. – С. 145–223.

12. *Размустова, Т. О.* Краеведческие музеи / Т. О. Размустова, А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия : в 2 т. – М., 2001. – Т. 1. – С. 298–301.

13. *Размустова, Т. О.* Местный музей: эволюция взглядов и динамика моделей / Т. О. Размустова // Российская провинция XVIII – XX веков: реалии культурной жизни : материалы III Всерос. науч. конф., Пенза, 25–29 июля 1995 г. – Пенза, 1996. – Кн. 2. – С. 140–145.

14. *Ревякин, В. И.* Историко-краеведческие музеи / В. И. Ревякин, А. Я. Розен. – М. : Стройиздат, 1983. – 136 с.

15. Терминологические проблемы музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР. – М., 1986. – 135 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. *Уланов, В. Я.* Опыт методики истории в начальной школе / В. Я. Уланов. – М. : Тип. т-ва И. Д. Сытина, 1914. – 240 с.

*I. Bambeshka*

**Local history museum: transformation of the definition and content of activity**

*On the basis of historical and genetic method the author analyzes the formation of the definition "Local History Museum" and the evolution of the content of its activity that is influenced by the transformation of socio-cultural context.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.11.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ